# З НАДЫХОДЗЯЧЫМ СВЯТАМ ПЕРШАМАЯ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 15 (651) | Аўторак, 28 красавіка 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**Няхай жыве 1-я Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).




## У МАНАЛІТНЫМ АДЗІНСТВЕ

Сёлета некалькі запазнілася вясна. Яшчэ не набрала сілу зеляніна, амаль не бачна першых вясновых кветак. Нягледзячы на гэта, нашы гарады і вёскі вабяць вока добраўпарадкаванасцю, сваім убраннем. Надыходзіць знамянальнае свята — Першамай, Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, які ўрачыста адзначаецца на ўсёй планеце.

Першае мая служыць агляду з'яднанасці працоўных усіх краін, іх рашучых дзеянняў супраць імперыялізму і рэакцыі. Чырвоныя флагі і сцягі развяваюцца над усімі кантынентамі. Савецкія людзі выйдуць на Першамайскія дэманстрацыі ў першых радах магутнай інтэрнацыянальнай шматмільённай арміі працоўных.

У нашай краіне стала выдатнай традыцыяй сустракаць свята Першамая высокімі вытворчымі паказчыкамі. Аб дасягнутых поспехах па ажыццяўленню гістарычных рашэнняў XXVII з'езда КПСС, заданняў XII пяцігодкі працоўныя калектывы адрапартуюць Радзіме, Камуністычнай партыі, праходзячы ў маналітных калонах па цэнтральных вуліцах і плошчах.

Першамайскае свята савецкія людзі сустракаюць у абстаноўцы вялікага працоўнага і палітычнага ўздыму, выкліканага рашэннямі студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, актыўным курсам партыі на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і дэмакратызацыю жыцця. Новы імпульс энергіі надае і ўсенародная падрыхтоўка да выбараў народных дэпутатаў у мясцовыя Саветы, якія сёлета будуць мець істотныя адметнасці.

Важнымі падзеямі ў жыцці краіны з'явіліся XVIII з'езд прафсаюзаў СССР і нядаўна завяршыўшы сваю работу XX з'езд Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. Абмеркаваныя на іх пытанні, прынятыя рашэнні сталі мабілізуючай сілай шматмільённых армій членаў прафсаюза і Ленінскага камсамола па ўзмацненню іх намаганняў у камуністычным будаўніцтве, творчага падыходу да вырашэння кожнай справы.

М. СТАРАВОЙТАЎ,
сакратар парткома ГДУ.

Для калектыву нашага універсітэта, як і ўсіх работнікаў вышэйшай школы, новым арыенцірам да дзеяння з'явіліся пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР па асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Неабходна многае зрабіць, каб на якасна новую ступень узняць падрыхтоўку і выхаванне будучых спецыялістаў, паглыбіць і павысіць эфектыўнасць вузаўскай навукі, як мага хутчэй укараніць студэнцкае самакіраванне. У гэтых напрамках праводзіцца значная работа. Сёння прыемна сказаць, што ў бягучым навучальным годзе ўжо абаронена 2 доктарскія і 8 кандыдацкіх дысертацый. Дасягнут самы высокі за апошнія гады ўзровень росту навуковага патэнцыялу кадраў універсітэта.

Студэнтамі універсітэта ўпісана шмат выдатных старонак у гісторыю патрыятычнага руху ў трэцім працоўным семестрах. Актыўна рыхтуюцца яны і да новага сезона. Сёлета ў атрадах будзе працаваць звыш тысячы юнакоў і дзяўчат. Яны ўнясуць свой пасільны ўклад у ажыццяўленне вытворчых планаў другога года бягучай пяцігодкі, канкрэтнай справай адкажуць на рашэнні XX з'езда ВЛКСМ і XXVIII з'езда камсамола Беларусі, падрыхтуюць дастойную сустрэчу слаўнаму 70-годдзю Вялікага Кастрычніка.

«Мір» і «Праца» — з гэтымі словамі заўсёды звязана свята 1 Мая. Захаваць мір на Зямлі, прадухіліць ядзерную катастрофу — самая важная праблема сучаснасці. Наша краіна робіць усё магчымае, каб спыніць гонку ўзбраенняў, аздаравіць міжнародную абстаноўку, прыступіць да паступовага раззбраення. У адзіным страі з савецкімі людзьмі ідуць працоўныя краін сацыялістычнай садружнасці. Яны памнажаюць патэнцыял сусветнага сацыялізму — магутнай, уплывовай сілы сучаснасці.

Працоўныя капіталістычных краін адзначаюць Першамайскае свята «Днямі дзеянняў», дэманстрацыямі, мітынгамі, маніфестацыямі, выступаюць супраць беспрацоўя, абмежавання ўсеўладдзя манаполій, супраць гонкі ўзбраенняў. Народы вызваліўшыхся краін выступаюць супраць націску імперыялізму, абараняюць свабоду і незалежнасць сваіх дзяржаў, змагаюцца за паспяховае завяршэнне нацыянальна-вызваленчага руху.

У гэты перадсвяточны дзень усе мы з упэўненасцю глядзім у будучыню, глыбока верым, што яна стане яшчэ больш заможнай і шчаслівай.

Ад імя парткома, рэктарата, грамадскіх арганізацый універсітэта горача віншую вас, дарагія таварышы, з надыходзячым святам Першамая, жадаю вам выдатных поспехаў у працы і вучобе, новых здзяйсненняў на карысць нашай Айчыны!

## З ЛЮБОЎЮ ДА ІЛЬІЧА

Калектыў нашага універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, прагрэсіўнае чалавецтва свету, шырока адзначыў 117-ю гадавіну з дня нараджэння стваральніка Камуністычнай партыі і першай у свеце Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна.

22-га красавіка студэнты гісторыка-філалагічнага і эканамічнага факультэтаў разам з прадстаўнікамі працоўных калектываў горада на яго цэнтральнай плошчы, якая носіць імя У. І. Леніна, усклалі кветкі да помніка правадыру працоўных свету.

Студэнты матэматычнага факультэта ўсклалі кветкі да помніка У. І. Леніну каля вучэбнага корпуса № 2.

Камсамольцы універсітэта правялі ў дзесяці падшэфных школах Цэнтральнага раёна Ленінскія ўрокі і піянерскія зборы, на якіх з пачуццём вялікай любві і павагі гаварылася пра дарагога для ўсіх нас Уладзіміра Ільіча.

У інтэрнаце № 4 члены літаратурнага клуба «Верас» народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання і другакурснікі біяфака выступілі з літаратурна-музычнай кампазіцыяй «Ленін і мір».

## АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

Рашэнні студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне», прынятыя па іх рэалізацыі пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР знаходзяцца цяпер у цэнтры ўвагі шматтысячнага калектыву нашага універсітэта. Гэтыя дакументы абмяркоўваліся на факультэтах і ў структурных падраздзяленнях ГДУ, дзе выяўляліся новыя рэзервы ў кадравай палітыцы, вызначаліся істотныя меры па далейшаму ўдасканальванню вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы.

На мінулым тыдні ў пятніцу адбыўся адкрыты агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Па дакладу рэктара акадэміка АН БССР Б. В. Бокуця шырока і падзелавому абмеркаваны задачы партыйнай арганізацыі і калектыву універсітэта, вынікаючыя з рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС і асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай школы.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта М. Ф. Гуліцкі, прарэктар па навуковай рабоце М. В. Навучыцель, рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» У. П. Балога, дэкан матэматычнага факультэта М. В. Селькін, загадчыца кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму Л. І. Нядзеля, студэнт фізічнага факультэта М. Р. Жукевіч, дацэнт кафедры эканомікі працы М. У. Акуліч, дацэнт кафедры агульнай фізікі І. В. Семчанка, сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

У рабоце агульнаўніверсітэцкага партыйнага сходу прыняў удзел інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ В. М. Коршыкаў.

## АБ ПЕРШАМАЙСКІХ УРАЧЫСТАСЦЯХ

Заўтра ў актавай зале адбудзецца агульнаўніверсітэцкі сход, прысвечаны Дню Міжнароднай салідарнасці працоўных — 1 Мая.

У праграме — урачыстая частка, святочны канцэрт.

Пачатак — у 19 гадзін.

• • •

1-га мая прадстаўнікі ўсіх факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў універсітэта прымуць удзел у агульнагарадской Першамайскай дэманстрацыі.

Збор — да 8 гадзін 30 мінут на факультэтах, у 9 гадзін — пастраенне ў калону каля галоўнага корпуса ГДУ.

**КАМСАМОЛЬЦЫ! МОЛАДЗЬ! АЖЫЦЦЯЎЛЯЙЦЕ РАШЭННІ XX З'ЕЗДА ВЛКСМ!**
**ПАМНАЖАЙЦЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І САВЕЦКАГА НАРОДА!**
**ВЕДЫ, ПЕРАКАНАННІ, ДЗЕЯННІ — СПРАВЕ ПЕРАБУДОВЫ!**

**(З Заклікаў ЦК КПСС).**

# ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ НАВІНЫ

## З добрым настроем

Надыходзяць хвалюючыя дні для выпускнікоў універсітэта. Хутка яны атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі. Для заўтрашніх маладых спецыялістаў засталіся апошнія выпрабаванні — дзяржаўныя экзамены і абарона дыпломных работ.

Як нам паведамілі ў вучэбным аддзеле універсітэта, экзамен па навуковаму камунізму здалі ўжо пяцікурснікі геалагічнага і фізічнага факультэтаў, студэнты спецыяльнасці АМАЭІ. Асабліва парадавалі добрым веданнем прадмета будучыя інжынеры-эканамісты. Таму свята вясны і працы яны сустракаюць па-свойму шчасліва.

Ідуць дзяржаўныя экзамены таксама на матэматычным і гісторыка-філалагічным факультэтах.

## У абарону Ч. Хайдэра

Сёння не знойдзеш у нашай краіне чалавека, якога б не хваляваў лёс амерыканскага вучонага-астрафізіка Чарльза Хайдэра, які, рызыкуючы сваім жыццём, імкнецца заклікаць Белы дом, амерыканскую адміністрацыю адмовіцца ад планаў «зоркавых войн», няспыннай гонкі ядзерных узбраенняў.

Тысячы савецкіх людзей выказваюць сваю салідарнасць з барацьбой мужнага вучонага за бяз'ядзерны свет.

У газеце «Комсомольская правда» за 14 красавіка г. г. пад рубрыкай «Пошта салідарнасці» была надрукавана паштоўка салідарнасці з барацьбой Ч. Хайдэра. Яе словы звернуты да прэзідэнта ЗША Рэйгана і патрабуюць спыніць выпрабаванне ядзернай зброі. «На вагах гісторыі, напісана ў паштоўцы, — цяпер знаходзіцца не толькі адно чалавечае жыццё, але і лёс усёй чалавечай цывілізацыі».

На паштоўках салідарнасці паставілі свае подпісы тысячы юнакоў і дзяўчат Савецкага Саюза і накіравалі іх у Белы дом.

Палічылі сваім патрыятычным абавязкам стаць удзельнікамі гэтай акцыі савецкай моладзі за выратаванне жыцця Ч. Хайдэра і міру на Зямлі і студэнты нашага універсітэта. Так, на эканамічным факультэце на паштоўках салідарнасці, якія адпраўлены ў Белы дом, паставілі свае подпісы 224 камсамольцы.

Праведзен збор подпісаў і на іншых факультэтах ГДУ.

## Гастролі студэнцкага тэатра

У новы гастрольны маршрут адправіцца на Першамайскае свята студэнцкі народны тэатр ГДУ «Люстэрка». Сваю апошнюю работу — спектакль «Рэвізор» па камедыі класіка рускай літаратуры М. В. Гогаля — самадзейныя артысты пакажуць працаўнікам Ельскага раёна.



На матэматычным і гісторыка-філалагічным факультэтах нашага універсітэта набываюць вышэйшую адукацыю юнакі і дзяўчаты з некалькіх замежных краін. У студэнцкім кафэ яны перыядычна праводзяць вечары інтэрнацыянальнай дружбы, прысвечаныя знамянальным падзеям. На гэты раз тут адбылася сустрэча з выпадку 41-ай гадавіны ўтварэння Сірыйскай Арабскай Рэспублікі.

**На здымку:** перад удзельнікамі ўрачыстасці выступае другакурснік матэматычнага факультэта Абдулрахман Нуеман.

Фота П. Страіцелева.

# ГІСТОРЫЯ — ВЯЛІКІ ВЫХАВАЦЕЛЬ

**У чытальнай зале універсітэта адбылася канферэнцыя чытачоў часопіса «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі бібліятэкі, адказныя работнікі абласнога савета Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры сустрэліся з прадстаўніком рэдакцыі — начальнікам аддзела прапаганды Рэспубліканскага Таварыства аховы помнікаў А. Д. Коласам.**

Канферэнцыю адкрыў старшыня навукова-метадычнага савета Гомельскага абласнога савета Таварыства аховы помнікаў дацэнт кафедры гісторыі СССР і БССР Г. С. Еўдакіменка. Ён адзначыў, што адной з галоўных задач на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва з'яўляецца выхаванне новага чалавека — патрыёта-інтэрнацыяналіста, ідэйна загартаванага, носьбіта слаўных рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый Камуністычнай партыі і савецкага народа. Вялікае значэнне ў гэтай рабоце мае прапаганда помнікаў гісторыі і культуры нашага народа, і самым актыўным прапагандыстам тут з'яўляецца часопіс «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Робіць сваю справу ён нядрэнна. Але яго можна зрабіць лепшым. Г. С. Еўдакіменка прапанаваў чытачам падзяліцца сваімі думкамі аб часопісе.

Гэту прапанову падтрымаў А. Д. Колас, які адзначыў, што рэдкалегія часопіса хацела б пачуць крытычны аналіз сваёй работы. На канферэнцыі выступілі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Жана Касцюкова, Тамара Смольская, Галіна Лазько, Алег Шляпін, Аляксандр Куроўскі, выкладчыкі У. У. Багамольнікаў, старшыня гістарычнай секцыі аблсавета Таварыства аховы помнікаў; В. І. Сычоў, рэктар народнага універсітэта па прапагандзе ведаў аб помніках; В. І. Галко, А. Н. Шчаглова, адказны сакратар Цэнтральнага райсавета таварыства. Даючы высокую ацэнку часопісу, адзначаючы яго вялікую папулярнасць сярод чытачоў, выступаўшыя выказалі рад прапаноў і заўваг. У прыватнасці, гаварылася аб тым, што часопіс павінен стаць больш баявым, яму трэба смялей выступаць супраць парушальнікаў закона аб ахове помнікаў, пісаць аб іх фельетоны, змяшчаць карыкатуры. Мэтазгодна таксама адкрыць у часопісе аддзел публіцыстыкі, знайсці месца для кутка сатыры і гумару. На думку чытачоў, рэдакцыйнай калегіі часопіса неабходна пісаць не толькі аб тых помніках, якія добра захаваліся, але і тых, што знаходзяцца ў аварыйным стане. Выказана пажаданне, каб большая ўвага ўдзялялася помнікам рэвалюцыйнай славы, з'яўляліся рэгулярныя рубрыкі «Гісторыі заводаў і фабрык», «У свеце працы і красы», метадычныя матэрыялы з абагульненнем вопыту работы пярвічных арганізацый, штогадовыя агляды аб выніках археалагічных раскопак і інш.

Уносіліся таксама прапановы аб пашырэнні кола аўтараў часопіса, павелічэнні яго тыражу, аб'ёму, набходнасці адлюстравання найбольш цікавых помнікаў у каляровых фотаздымках. Адзначана, што неапраўдана мала ўдзяляецца ўвагі на старонках часопіса помнікам Гомельшчыны.

А. Д. Колас запэўніў удзельнікаў канферэнцыі, што выказаныя прапановы і заўвагі будуць уважліва прааналізаваны рэдкалегіяй часопіса.

Пасля заканчэння канферэнцыі яе ўдзельнікі змаглі азнаёміцца з выстаўкай нумароў часопіса «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі».



Слаўная гісторыя ва Усесаюзных камуністычных суботнікаў, якія прысвячаюцца гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і праводзяцца напярэдадні Першамайскага свята. У гэты дзень савецкія людзі дэманструюць узоры высокапрадукцыйнай ударнай працы і старанасці на добраўпарадкаванні гарадоў і вёсак.

Як заўсёды, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта прынялі актыўны ўдзел у сёлетнім суботніку.

НА ЗДЫМКУ: загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды прафесар Б. П. Савіцкі і асістэнт гэтай кафедры В. М. Верамееў абкапваюць дрэвы на тэрыторыі універсітэта.

Фота У. Чысціка.

*Памятныя мясціны Гомеля*

# Вуліца імя Д. А. Жаркоўскага

У дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці захаваліся дакументы, якія ўтрымліваюць факты з жыцця і дзейнасці А. А. Жаркоўскага, імем якога названа былая Аптэчная вуліца нашага горада. Дакументы сведчаць, што А. А. Жаркоўскі адыграў вялікую ролю ў рабоце прафсаюзаў г. Гомеля ў 1918—1919 гг.

У перыяд нямецкай акупацыі г. Гомеля, з'яўляючыся членам праўлення Гомельскага прафсаюза прыказчыкаў і канторшчыкаў (праўленне размяшчалася ў той час у доме № 54 па Аптэчнай вуліцы), Жаркоўскі ў лістападзе-снежні 1918 г. прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі забастоўкі служачых устаноў і прадпрыемстваў нашага горада з мэтай павышэння заработнай платы нізкааплачваемым работнікам. А. А. Жаркоўскі ўвайшоў у састаў стачачнага камітэта, які кіраваў забастоўкай.

У пачатку студзеня 1919 г. часці Чырвонай Арміі вызвалілі г. Гомель ад нямецкіх акупантаў. Дзейнасць Жаркоўскага ў прафсаюзе разгарнулася з поўнай сілай. Прафсаюз прыказчыкаў і канторшчыкаў быў рэарганізаваны ў прафсаюз гандлёвых і прамысловых служачых. Жаркоўскі зноў выбіраецца членам праўлення і прэзідыума праўлення прафсаюза, а таксама членам кантактнай камісіі для ўрэгулявання пытанняў, звязаных з беспрацоўем, забеспячэннем фабрык сыравінай, насельніцтва — прадуктамі харчавання.

19 студзеня 1919 г. на пасяджэнні праўлення прафсаюза Жаркоўскі зрабіў даклад аб рабоце нарады прадстаўнікоў прафсаюзаў г. Гомеля, якое вырашыла аб'явіць 20 студзеня днём жалобы ў сувязі з гібеллю нямецкіх рэвалюцыйных марксісцкіх дзеячоў Карла Лібкнехта і Розы Люксембург. Па прапанове Жаркоўскага была арганізавана жалобная маніфестацыя і зроблены жалобны сцяг з надпісам: «Вечная памяць загінуўшым барацьбітам пралетарскай рэвалюцыі тт. Карлу Лібкнехту і Розе Люксембург ад прафесіянальнага саюза гандлёва-прамысловых служачых».

А. А. Жаркоўскі выбіраўся членам і ўдзельнічаў у рабоце розных камісій: па арганізацыі працаўладкавання беспрацоўных членаў прафсаюза, арганізацыі прафсаюзнай канферэнцыі, па прыёму ў прафсаюз новых членаў, накіраванню членаў у прафшколу, па падрыхтоўцы выбараў у Савет дэпутатаў.

У красавіку 1919 г. Жаркоўскі выступіў перад членамі прафсаюза з дакладам аб рабоце саюза, расказаў ім аб эканамічнай, арганізацыйнай і культурна-асветнай рабоце, аб белапольскай пагрозе. Была прынята пастанова аб стварэнні ўзброенага рабочага атрада для адпору белапалякам «пад кантролем усіх палітычных партый, якія змагаюцца за Савецкую ўладу».

23 красавіка Жаркоўскі прыняў удзел у рабоце пленума губернскага Савета прафесіянальных саюзаў у якасці дэлегата ад прафсаюзаў гандлёвых і прамысловых служачых, на якім ён быў выбраны ў Савет прафсаюзаў. У абласным архіве захаваўся спіс дэлегатаў, выбраных у Савет прафесіянальных саюзаў, у якім ёсць прозвішча А. А. Жаркоўскага, члена РКП(б).

24 красавіка 1919 г. Гомельскі павятовы камітэт РКП(б) у сувязі з белапольскай пагрозай прыняў рашэнне аб стварэнні пралетарскага батальёна. Усім ячэйкам РКП(б) пры прафсаюзах, установах, на прадпрыемствах было прапанавана тэрмінова мабілізаваць да 50% сваіх членаў. Кіруючыся пачуццём патрыятызму і высокага партыйнага абавязку, Жаркоўскі ўступіў добраахвотнікам у Першы Гомельскі пралетарскі батальён. Ужо ў пачатку мая 1919 г. батальён быў адпраўлены на Заходні фронт. У жорсткіх баях супраць пераўзыходзячых сіл праціўніка ў чэрвені пад Маладзечна батальён страціў большую частку свайго асабовага саставу. Па-геройску загінуў у няроўным баі камісар батальёна А. А. Жаркоўскі.

Атрымаўшы паведамленне аб гібелі Жаркоўскага, праўленне Гомельскага прафсаюза гандлёва-прамысловых служачых правяло 18 чэрвеня 1919 г. жалобнае пасяджэнне, прысвечанае яго памяці. З мэтай увекавечання памяці Жаркоўскага праўленне пастанавіла вывесіць у памяшканні прафсаюза партрэт тав. Жаркоўскага і мемарыяльную дошку з адпаведнай рэвалюцыйнай эпітафіяй, прасіць гарвыканком перайменаваць Аптэчную вуліцу ў вуліцу Жаркоўскага.

**В. ЛУГАЎСКАЯ,**
**заг. аддзела Гомельскага аблдзяржархіва.**



*ТРАДЫЦЫІ*

# У ГАСЦЯХ—СУСЕДЗІ

Па запрашэнню універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Крыніцы» нядаўна ў ГДУ прыязджалі на чарговую творчую сустрэчу з выкладчыкамі і студэнтамі гісторыка-філалагічнага факультэта літаратары з суседняй Чарнігаўскай вобласці.

На сустрэчы выступіў сакратар Чарнігаўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Украіны Станіслаў Рап'ях, які прачытаў свае апошнія вершы, пераклады на ўкраінскую мову твораў беларускіх аўтараў.

Потым гучалі вершы паэтаў Васіля Будзённага, аўтара дзвюх паэтычных кніг, Уладзіміра Сапона, ў якога выйшаў зборнік паэзіі «Зірка на пілотцы», і Алеся Алейніка. Госці падзяліліся сваімі творчымі планамі, адказалі на пытанні.

З прывітальнымі словамі да ўкраінскіх паэтаў звярнуліся загадчык кафедры беларускай літаратуры дацэнт І. Ф. Штэйнер і дацэнт, паэт Віктар Ярац. Свае вершы прачытала студэнтка 4-га курса гістфіла Інэса Тарасава.

У цёплай і сяброўскай атмасферы прайшла творчая сустрэча, на якой гучалі ўсім зразумелыя беларуская і ўкраінская мовы.

**Мікалай ШУКАНАЎ,**
**студэнт гр. БР-43**
**гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**НА ЗДЫМКУ: Станіслаў Рап'ях уручае кнігу нарысаў на памяць аб сустрэчы загадчыку кафедры беларускай літаратуры І. Ф. Штэйнеру.**

Фота **А. Ульянкінай.**

# СУСТРЭЧА З ПАЭТАМ

Днямі адбылася сустрэча студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта з выпускніком ГДУ, паэтам, аўтарам зборніка вершаў «Начны паром» Міхасём Башлаковым. Ён расказаў аб сабе, сваім творчым шляху, гісторыі напісання вершаў, чытаў новыя, нядаўна напісаныя ім паэтычныя радкі.

Шчырасць і лірызм, тонкасць светаўспрымання і мудрая жыццёвасць жывуць адначасова ў яго вершах. У іх чуецца сапраўдны гімн беларускаму вясковаму Палессю, нашай роднай бацькаўшчыне. Гімн краю з даўняй і багатай гісторыяй прасякнуты аптымістычнай і жыццесцвярджальнай сілай.

У час сустрэчы ўсталявалася атмасфера ўзаемаразумення і давер'я. Ішоў плённы і востры дыялог аб праблемах сучаснай паэзіі.

Студэнты пазнаёміліся з цікавым чалавекам, нашым сучаснікам, адчулі хараство і вялікую сілу паэзіі.

**С. ХАНЕНЯ,**
**Д. МАМАЧКІН,**
**студэнты 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ПА ПРАБЛЕМАХ ВЫКЛАДАННЯ МАТЭМАТЫКІ

У Талінскім політэхнічным інстытуце адбылася VI занальная нарада-семінар загадчыкаў кафедр і вядучых выкладчыкаў матэматыкі ВНУ Беларусі, рэспублік Прыбалтыкі і Калінінградскай вобласці.

Прынятыя нядаўна пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне надалі творчы імпульс рабоце нарады-семінара, прысвечанага методыцы выкладання матэматычных навук у ВНУ. Адзначаючы ўзрастаючую ролю матэматыкі ў розных галінах, удзельнікі нарады асноўную ўвагу сканцэнтравалі на праблемах матэматычнай адукацыі.

У дакладзе акадэміка АН СССР А. Д. Аляксандрава аналізаваліся прычыны нізкага ўзроўню выкладання матэматыкі ў школах. Ён гаварыў аб тым, што многія выкладчыкі дрэнна валодаюць курсам школьнай матэматыкі, не ўмеюць рашаць задачы, і для таго, каб павысіць веды настаўнікаў, неабходна змяніць існуючую сістэму іх падрыхтоўкі ў ВНУ. У прыватнасці, акадэмік А. Д. Аляксандраў прапанаваў вызваліць матэматычныя дысцыпліны на малодшых курсах ад залішняй фармалізацыі і весці выкладанне проста і наглядна.

Прафесар БДУ імя У. І. Леніна Ю. С. Багданаў таксама спыніўся на праблемах перабудовы выкладання матэматыкі, пры гэтым ён асабліва падкрэсліваў небяспеку зніжэння прафесіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў у сувязі з тэндэнцыяй скарачэння колькасці лекцый за кошт фундаментальных матэматычных дысцыплін.

Ад нашага універсітэта ў нарадзе-семінары прымалі ўдзел загадчыкі кафедр матэматычнага факультэта дацэнты Ю. У. Малінкоўскі, У. І. Міроненка, У. М. Семянчук, аўтары гэтых радкоў. Зробленыя прадстаўнікамі ГДУ даклады выклікалі цікавасць і дыскусію.

Хочацца адзначыць узорную падрыхтоўку такой прадстаўнічай нарады-семінара. Арганізатары зрабілі ўсё магчымае для плённай работы яе ўдзельнікаў, іх культурнага адпачынку. Былі праведзены экскурсіі па Таліну, мы наведалі вучэбныя карпусы і вылічальны цэнтр політэхнічнага інстытута. Вялікія ўражанні засталіся ад канцэрта арганнай музыкі, наведвання тэатраў і музеяў. Усім удзельнікам запамятаўся вечар дружбы, які праходзіў ў старажытным замку, адноўленым рукамі студэнтаў політэхнічнага інстытута.

**В. ХАРЛАМАВА,**
**дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі,**
**А. СКІБА,**
**ст. выкладчык кафедры алгебры і геаметрыі.**

*Маршрутамі студэнцкіх падарожжаў*

# ПРАЗ ЧАТЫРЫ МОРЫ І АКІЯН

**(Заканчэнне. Пачатак у №№ 13, 14)**

На наступны дзень «Латвія» адплыла ад берагоў Іспаніі і ўзяла курс на востраў Мальту.

Наш цеплаход вельмі часта суправаджалі дэльфіны, многія з нас упершыню ўбачылі марскіх чарапах.

Дзень 16 сакавіка стаў днём Беларусі. Мы пазнаёмілі ўсіх ўдзельнікаў круіза з гісторыяй нашай рэспублікі, яе сталіцай — горадам-героем Мінскам, а вечарам выступілі з канцэртам. 18 сакавіка у 12 гадзін мы прыплылі на Мальту.

## МАЛЬТА

Рэспубліка Мальта размешчана на пяці астравах, з якіх заселены толькі тры. Яе плошча — 316 кв. км, насельніцтва — ўсяго 340 тыс. чалавек. У XIV стагоддзі гэты востраў сталі засяляць англічане. Яны былі вельмі багатыя, будавалі свае саборы, храмы. Сталіца Мальты — г. Ла-Валета, раней называлася Даунай. Апошнюю назву атрымала ў гонар главы мальційскага ордэна і ў той жа час галоўнага яе архітэктара.

На тэрыторыі вострава 355 дзеючых цэркваў і сабораў. Рух на вуліцах левабаковы, што для нас было вельмі непрывычным. Вуліцы зусім вузкія, таму што пад пабудовы выкарыстоўваецца кожны метр зямлі. Святлафораў на вуліцах няма. Некалі яны былі, аднак сапсаваліся і за непатрэбай іх убралі наогул.

У краіне стаіць вострая праблема пітной вады. Таму яе прывозяць на Мальту з Італіі. У невялікіх лясах дзікіх жывёл няма. Бедная Мальта і на карысныя выкапні: за выключэннем вапняку і блакітнай гліны тут нічога не здабываецца. Краіна жыве за кошт турызму. У год востраў наведвае прыкладна мільён турыстаў. А яшчэ мальційцы атрымліваюць даходы ад рамонту суднаў, прадукцыі тэкстыльнай прамысловасці. Мальта імпартуе амаль усё з іншых краін, з Савецкага Саюза, у прыватнасці, аўтамабілі «Лада».

Мы наведалі старажытную сталіцу Мальты — Мдзіну. Складвалася ўражанне, што горад вымер. У нейкай ступені гэта так і ёсць на самой справе. Людзі не хочуць сяліцца тут, таму што дамы вельмі старыя, цёмныя і ў час дажджоў не ацяпляюцца. З аглядавай пляцоўкі Мдзіны добра бачны цэнтр вострава — Моста, на месцы якога стаіць храм. Пабывалі мы і ў храме святой Марыі. Ён чацвёрты па вышыні сярод храмаў свету. У 1942 г. у час бамбёжкі праз верхні купал ўпала бомба, але не ўзарвалася. У той час ішла служба, але ахвяр не было. Гэта яшчэ больш узвысіла храм у свядомасці мальційцаў.

Вечарам таго ж дня адбылас наша сустрэча з мальційскай моладдзю.

Пачатковая адукацыя на Мальце бясплатная. Хлопчыкі і дзяўчынкі займаюцца асобна: першыя — у тэхнічных школах, дзяўчынкі — у гандлёвых. У рэспубліцы — адзін універсітэт, дзе навучанне платнае. Штогод шэсць мальційскіх студэнтаў накіроўваюцца на вучобу ў Савецкі Саюз.

Цікавымі былі экскурсіі. Перш за ўсё мы наведалі сады ў стылі барока, дзе з аглядавай пляцоўкі адкрываўся від на Вітарыёзу — порт, у якім знаходзіўся наш цеплаход, — і на Міжземнае мора. Затым мы агледзелі старажытны храм, які існуе амаль 6 тысяч гадоў. Дакладней сказаць, яго рэшткі, бо за такі адрэзак часу ад храма мала чаго засталося. У музеях, куды мы трапілі, убачылі знаходкі археолагаў — рэчы, зробленыя задоўга да нашай эры.

Пасля абеду мы наведалі рыбацкі востраў і рэзідэнцыю прэзідэнта, залу, дзе ён праводзіць прыёмы замежных паслоў.

Калі мы вярталіся на цеплаход, убачылі дэманстрацыю рабочых. У тыя дні ў рэспубліцы праходзіла перадвыбарчая кампанія, і на транспарантах, што неслі дэманстранты, выказваліся патрабаванні і інтарэсы партый, за якія выступалі рабочыя.

А вечарам наш цеплаход узяў курс на Грэцыю — апошнюю краіну ў нашым падарожжы. На наступны дзень у нас праходзіў «Дзень Нептуна». Гэта было сапраўднае свята падводнага царства. На цеплаходзе ўладарылі Нептун, чэрці і піраты — усе ўдзельнікі круіза былі ў карнавальных касцюмах.

## ГРЭЦЫЯ

Мы прыплылі ў порт Пірэй — прыгарад сталіцы Грэцыі Афіны. У Пірэі захаваліся месцы, характэрныя для антычнай Грэцыі. Пірэй — «марскія вароты» Грэцыі, праз якія праходзіць шмат замежных гандлёвых суднаў.

Сталіца краіны разам з Пірэем і яшчэ 30 невялікімі гарадамі складае вялікія Афіны. У 80 км ад сталіцы знаходзіцца самая паўднёвая кропка паўвострава — мыс Сунаі, на які мы адправіліся на аўтобусах. Тут знаходзіцца старажытны храм Грэцыі, які быў пабудаваны ў гонар бога мора — Пасейдона.

Грэцыя размешчана на тысячы астравоў і паўастравоў. Адны з іх густа населены, дзе жывуць багатыя грэкі, бліжэй да Турцыі — больш беднае насельніцтва. У Афінах вельмі дарагая зямля, і горад забудоўваўся без адзінага плана. Усё жыллё знаходзіцца ў прыватным уладанні, таму гэта ўносіць свае цяжкасці ў жыццё маладых і бедных людзей. Сярэдняя заработная плата працоўнага складае 60—70 тысяч драхм, а плата за двухпакаёвую кватэру надзвычай высокая, у дадатак да гэтага асобна каштуюць іншыя паслугі: вада, тэлефон, цэнтральнае ацяпленне.

Шмат цікавых, каларытных адметнасцей заўважылі мы ў Грэцыі, калі рабілі экскурсіі па сталіцы, яе ваколіцах. Але ні з чым нельга параўнаць тое, што ўбачылі мы ў выдатным помніку архітэктуры Грэцыі — Акропалі, — «верхнім горадзе». Акропаль размешчаны на невялікім камяністым узгорку. Тут захаваліся руіны некалькіх архітэктурных помнікаў Старажытнай Грэцыі і самы значны з іх — Парфенон, пабудаваны архітэктарамі Ікцінам і Калікратам у 447—438 гг. да нашай эры. Храм павінен быў служыць велічным і прыгожым архітэктурным аздабленнем грандыёзнай статуі багіні-заступніцы горада Афіны — Палады. Статуя знаходзілася ў храме і была вельмі шаноўным прадметам культу старажытных егіпцян. Аднак, да нашых дзён яна не захавалася.

Побач з Парфенонам узвышаецца другі славуты храм Акропаля — Эрэхтэйон, узведзены ў 421—406 гг. да нашай эры.

З вяршыні Акропаля адкрываецца цудоўная панарама горада, на амфітэатр і месца, дзе праходзілі народныя гулянні. На тэрыторыі Акропаля ёсць цікавы археалагічны музей, у якім мы ўбачылі старажытныя статуі.

Пасля знаёмства з Акропалем у нас адбылася экскурсія па Афінах. Тут асаблівую нашу ўвагу прыцягнуў стадыён, дзе ў 1896 годзе былі праведзены першыя Алімпійскія гульні. Па-свойму арыгінальнымі здаліся нам будынкі універсітэта, Акадэміі навук.

Стаянка цеплахода ў Грэцыі падыходзіла да канца. У 22 гадзіны ён пакінуў яе берагі і ўзяў курс да берагоў нашай Радзімы. Мы перасеклі пралівы Дарданелы і Басфор, праплылі пад велічным збудаваннем XX стагоддзя, мастом, які аб'ядноўвае дзве часткі свету — Еўропу і Азію.

Чорнае мора сустрэла нас штормам. Яно поўнасцю апраўдала сваю назву — вада ў ім была чорнай і мутнай.

25 красавіка ў 9 гадзін наш цеплаход прышвартаваўся ў порце горада-героя Адэсы. Мы дома! Розныя пачуцці перапаўнялі сэрцы ўдзельнікаў круіза. Радасна было на душы ад сустрэчы з роднай зямлёй і адначасова сумна ад таго, што трэба развітвацца з сябрамі, якіх у кожнага з нас з'явілася так многа за два тыдні захапляючага падарожжа. Мы раз'язджаліся па сваіх гарадах і везлі з сабой адрасы сяброў, цудоўныя ўражанні. Усе мы будзем доўга памятаць наша падарожжа, дні якога былі так не падобны адзін на другі.

**А. БАЛОГА,**
**А. МЕЛЕЖ,**
**студэнты 3-га курса эканамічнага факультэта.**

